Источник: "Беларусь" — № 11, 2013–11–25





БЕЛТА

Вось такая яна, беларуская моладзь

# Традыцыя быць у авангардзе

## Ідэя пра аб'яўленне маладзёжнай будоўляй узвядзенне Беларускай АЭС знайшла падтрымку на самым высокім узроўні

На форуме "Традыцыі. Моладзь. Будучыня" кіраўнік дзяржавы паабяцаў, што ў бліжэйшы час на сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным яны разгледзяць гэтую ініцыятыву, паколькі БелАЭС будзе ўзводзіцца з удзелам расійскіх спецыялістаў. А наогул Прэзідэнт Беларусі раіць моладзі не шукаць хуткіх і лёгкіх грошай, а паслядоўна дабівацца ўсяго ўласным розумам і працай. Паводле слоў Прэзідэнта, складнікі сапраўднага прафесіяналізму — гэта не толькі ўменні і вопыт, але і глыбокія веды, якія выходзяць за межы вузкай прадметнай сферы, і схільнасць да выбранай прафесіі, што даюць здольнасць арыгінальна мысліць, і творчае азарэнне, якое спараджае геніяльныя ідэі і адкрыцці. Аляксандр



Васіль Харытонаў. Традыцыя быць у авангардзе

Лукашэнка прапанаваў абвясціць 2015 год у Беларусі Годам моладзі. Як адзначыў Прэзідэнт, сёння часта са шкадаваннем або горыччу гавораць, што сучаснае маладое пакаленне стала больш прагматычным. "Мне падаецца, што гэта не больш чым знак часу. Прычым не магу адназначна сказаць, які менавіта знак — плюс або мінус, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Бо прагматызм азначае не толькі карысць і эгаізм. У яго ёсць і іншыя бакі — цвярозы погляд на жыццё, свабода ад ілюзій і пачуццё адказнасці за сваё цяперашняе і, самае галоўнае, будучае".

Прэзідэнт адзначыў, што любы, хто жадае зарабіць у Беларусі, можа гэта зрабіць. "На любы густ можна знайсці працу, варта толькі захацець", — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён заклікаў моладзь не ставіць адразу для сябе за мэту адкрыць фірму і быць там кіраўніком. Прэзідэнт адзначыў, што быць бізнесменам не так проста, як можа падавацца на першы погляд моладзі, і не кожнаму гэта дадзена. "Атрымалі прафесію — паспрабуйце яе на смак. Не спяшайцеся кідаць".

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў рабоце з маладым пакаленнем дзяржава абапіраецца на Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі як на перадавы атрад, што аб'ядноўвае амаль паўмільёна чалавек, або пятую частку моладзі краіны. "Мы абсалютна не скрываем таго, што ставім перад БРСМ ідэалагічныя і палітычныя задачы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але гэтыя задачы звязаныя не з ператварэннем яго членаў у чыіхсьці "ястрабаў" або "сокалаў". А перш за ўсё — з фарміраваннем з маладых людзей патрыётаў нашай краіны". Аляксандр Лукашэнка згадаў таксама праект БРСМ "100 ідэй для Беларусі". На думку Прэзідэнта, цяпер прынцыпова важна давесці перспектыўныя распрацоўкі да ўкаранення, накіраваўшы на гэтыя мэты рэсурсы Акадэміі навук і інавацыйных фондаў міністэрстваў. Кіраўнік дзяржавы даручыў НАН Беларусі і Ураду вылучыць з дзясятак самых перспектыўных ідэй, якія можна пачаць рэалізоўваць у самы блізкі час.

Беларуская моладзь павінна назаўсёды выпрацаваць у сабе імунітэт да разбуральных радыкальных ідэалогій, — заявіў Аляксандр Лукашэнка на маладзёжным форуме "Традыцыі. Моладзь. Будучыня".

Паводле слоў Прэзідэнта, супраць рэвалюцый і ўзрушэнняў выступае ўся гісторыя Беларусі. "У мінулым стагоддзі наш народ вычарпаў ліміт на войны, рэвалюцыі і ўзрушэнні", — адзначыў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што ні аднаму пакаленню беларусаў не ўдавалася пражыць жыццё мірна, спакойна і бяспечна. "І хоць маладосці заўсёды ўласціва патрабаваць радыкальнай ломкі і неадкладных перамен, я заклікаю вас задумацца над урокамі гісторыі. Ці прыносілі ўзрушэнні каму-небудзь шчасце? Не, яны неслі з сабою толькі разгубленасць у розумах, беды і разруху. І ніколі, падкрэсліваю, ніколі не абыходзіліся без крыві", — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт успомніў аб Палацы Незалежнасці як знаку беларускай дзяржаўнасці. Ён адзначыў, што гэты будынак пабудаваны сіламі беларускіх спецыялістаў з айчынных матэрыялаў і з'яўляецца ўвасабленнем таго, на што здольныя беларусы.

Васіль **Харытонаў**